**Віктар Чараўко** *(Полацк, Беларусь)*

# ТАСТАМЕНТЫ І ПАХАВАЛЬНАЯ ПРАКТЫКА НАСЕЛЬНІЦТВА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ XVI–XVIII стст.: МЕСЦА ПАХАВАННЯ

Нашы веды аб пахавальнай практыцы насельніцтва Паўночнай Беларусі істотна адрозніваюцца ў залежнасці ад разглядаемай эпохі. Археалагічнае вывучэнне помнікаў другой паловы I – першых стагоддзяў II тыс. н. э. дазволіла казаць пра асаблівасці пахавальнага абраду гэтага часу[1]. Дзякуючы этнаграфічным назіранням, добра вядомы пахавальна-памінальныя традыцыі XIX – пачатку XXI ст. Своеасаблівая лакуна – XIV–XVIII стст. Планамерных этнаграфічных назіранняў на Беларускім Падзвінні тады не праводзілася. Каштоўную інфармацыю ўтрымлівае «Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў, іх шлюбныя і пахавальныя абрады, побыт і адзенне...» Паўля Одэрборна[2] (1582)[3], але гэтыя звесткі не з'яўляюцца вычарпальнымі.

[1] Штыхаў Г. В. Крывічы: па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі. Мінск, 1992.

[2] Одэрборн П. Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў // БГА. 2005. Т. 12, сш. 1–2. С. 176–177.

[3] Сагановіч Г. Паўночная Беларусь у апісанні Паўля Одэрборна // Там жа. С. 163.

Мэтанакіраванае археалагічнае вывучэнне пахаванняў позняга сярэдневякоўя – ранняга Новага часу пачалося толькі ў канцы XX ст.[1] Археалагічныя крыніцы характарызуюць матэрыяльны вынік пахавальнага абраду, але не ўтрымліваюць інфармацыі аб тых рытуальных дзеяннях, што не пакідаюць матэрыяльных рэшткаў (падрыхтоўцы цела памерлага, выбары месца для пахавання, ажыццяўленні рэлігійных абрадаў). Для больш поўнай рэканструкцыі пахавальных традыцый звесткі археалагічных крыніц па магчымасці трэба дапаўняць інфармацыяй пісьмовых крыніц. Звесткі аб пахавальнай практыцы насельніцтва Беларусі XVI–XVIII стст. утрымліваюцца ў такой катэгорыі дакументальных крыніц, як *тастаменты.*

Практыка складання завяшчанняў-тастаментаў набыла пашырэнне ў асяроддзі шляхты і мяшчан Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVI–XVIII ст. Пасля смерці аўтараў тастаменты актыкаваліся – запісваліся ў земскія, гродскія або магістрацкія актавыя кнігі[2]. Асноўны змест тастаментаў складаюць распараджэнні маёмаснага характару, якія рэгулявалі перадачу зямельных уладанняў і рухомай маёмасці ў спадчыну. Каштоўныя для нас пажаданні адносна абставін пахавання не былі абавязковай часткай завяшчанняў, але прысутнічаюць у шэрагу тастаментаў.

Намі выкарыстаны 51 тастамент з распараджэннямі складальнікаў адносна абставін пахавання (табл. 1). Завяшчанні належалі прадстаўнікам шляхецкага і мяшчанскага саслоўяў, якія пражывалі на тэрыторыі Полацкага і Віцебскага ваяводстваў у другой палове XVI–XVIII ст. Названыя тастаменты апублікаваны

---

[1] Климов М. В., Черевко В. В. Погребальные памятники полоцкой округи XIII–XVIII вв. // Полоцк : Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.]; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.); науч. ред. О. Н. Левко. Минск, 2012. С. 176–177.

[2] Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / склад.: А. Ф. Аляксандрава, В. У. Бабкова, І. М. Бобер. Мінск, 2012. С. 16–17.

ў часопісе «Руская даўніна»[1], 19, 21, 22, 24–27 і 31 тамах серыйнага выдання дакументаў «Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы»[2], зборніку «Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст.»[3], а таксама ў якасці дадаткаў у артыкулах В. У. Галубовіча[4], М. Ю. Гардзеева і Н. У. Сліж[5]. Дадаткова выкарыстаны звесткі з прац О. Гедэмана[6] і Д. У. Дука[7], дзе ў вытрымках або пераказах утрымліваецца інфармацыя аб тастаментах яшчэ 15 асоб, звязаных з Паўночнай Беларуссю (табл. 2).

Складанне завяшчання звычайна адбывалася пры старэчай нямогласці і/або ў час цяжкай хваробы[8], таму можа разглядацца ў ліку дзеянняў па падрыхтоўцы да пахавання. Пажаданні тэстатара адносна акалічнасцей пахавальнай цырымоніі адлюстроўваюць удзел складальніка завяшчання ў падрыхтоўцы да ўласнага пахавання. Гэта суадносіцца з этнаграфічнымі данымі: паводле назіранняў, зробленых у Веляшковіцкай воласці Віцебскага

---

[1] Завещание Юрия Деспота Зеновича, 1582 г. [Электронный ресурс] // Русская старина. 1878. Т. XXII, вып. 7. Режим доступа: https://www.runivers.ru/lib/book4646/57384/. Дата доступа: 28.09.2018.

[2] ИЮМ. Витебск, 1889. Вып. 19; ИЮМ. Витебск, 1891. Вып. 21; ИЮМ. Витебск, 1891. Вып. 22; ИЮМ. Витебск, 1893. Вып. 24; ИЮМ. Витебск, 1894. Вып. 25; ИЮМ. Витебск, 1895. Вып. 26; ИЮМ. Витебск, 1898. Вып. 27; ИЮМ. Витебск, 1903. Вып. 31.

[3] Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст.

[4] Галубовіч В. У. Тэстамент 1623 года полацкага зямяніна Арэхавінскага // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. прац Міжнар. навук.-практ. канф. : у 2 ч. Наваполацк, 2011. Ч. 2.

[5] Гордеев М. Ю. Новые данные к биографии Симеона Полоцкого : завещание матери просветителя // Славяноведение. 1999. № 2; Гардзееў М. Ю., Сліж Н. У. Шляхецкія тэстаменты ў актавай кнізе полацкага магістрата за 1656–1657 гады // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. 2013. № 1.

[6] Hedemann O. Testamenty brasławsko-dziśnieńskie XVII–XVIII wieku jako źródło historyczne. Wilno, 1935.

[7] Дук Д. В. Археологические следы средневековых кладбищ на территории Полоцка // Полоцк : Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке.

[8] Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. С. 27.

*Табліца 1.* **Распараджэнні складальнікаў тастаментаў адносна месца пахавання**

| № | Складальнік | Год складання | Саслоўе | | Распараджэнні адносна месца пахавання | | | | | | Крыніца |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Шляхта | Мяшчане | Могілкі пры храме | У храме | У храме пад алтаром / парогам | У / каля капліцы | Манастырскія могілкі | У маёнтку | |
| 1 | Занка Алехнавіч Рамейка Хоцімскі | 1559 | + | | | + | | | | | Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. С. 182–185 |
| 2 | Стэфан Цімафеевіч Лускіна | 1594 | + | | | | | | | | Там жа. С. 196–197 |
| 3 | Андрэй Якубавіч Сівіцкі | 1594 | + | | | | | + | | + | Там жа. С. 203–205 |
| 4 | Шчасны Пятровіч Храноўскі | 1595 | + | | + | | + | | | | Там жа. С. 220–222 |
| 5 | Алехна Паўлавіч Варатынец | 1595 | + | | + | | | | | + | Там жа. С. 225–227 |
| 6 | Мацвей Мікалаевіч Мажэйка | 1596 | + | | | + | | | | + | Там жа. С. 230–232 |
| 7 | Багдан Жданавіч Янушкоўскі | 1596 | + | | | | | | | | Там жа. С. 234–236 |
| 8 | Ілля Паўлавіч Варатынец | 1596 | + | | | | | | | + | Там жа. С. 244–246 |
| 9 | Марына Данілаўна Стэфанаўная Любашчанская | 1596 | + | | | | | | | | Там жа. С. 249–250 |

*Працяг табл. 1*

| № | Складальнік | Год скла-дання | Саслоўе | | Распараджэнні адносна месца пахавання | | | | | | Крыніца |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Шляхта | Мяшчане | Могілкі пры храме | У храме | У храме пад алтаром / парогам | У / каля капліцы | Мана-стырскія могілкі | У маёнт-ку | |
| 10 | Валерыян Арэхавінскі | 1623 | + | | | + | | | | + | Галубовіч В. У. Тэстамент 1623 года полацкага зямяніна Арэхавінскага. С. 31 |
| 11 | Міхаіл Скірмант | 1657 | + | | | | | | | + | Гардзееў М. Ю., Сліж Н. У. Шляхецкія тэстаменты ... С. 33–34 |
| 12 | Таццяна Якаўлеўна Шараметава | 1657 | | + | + | | | | | | Гордеев М. Ю. Новые данные к биографии Симеона Полоцкого. С. 47 |
| 13 | Еўфрасіння Мікалаеўна Чарнаброўкава | ? | | + | + | | | | | | ИЮМ. Вып. 19. С. 62–63 |
| 14 | Людвіг Ляцецкі | 1763 | + | | | | | | | | Там жа. С. 112. |
| 15 | Пётр Чыж | 1764 | + | | | + | | | + | | Там жа. С. 134–136 |
| 16 | Еўдакія Шыбра | 1772 | | + | + | | | | | | Там жа. С. 216 |
| 17 | Жонка Міхаіла Лагошнага | ? | | + | | + | | | | | Там жа. С. 253 |
| 18 | Павел Савіцкі | 1775 | | + | | + | | | | | Там жа. С. 253 |
| 19 | Уладзіслаў Звярэўскі | 1712 | + | | | + | | | | | Там жа. С. 439 |
| 20 | Тэадора Янава Прэвальская | 1713 | + | | | + | | | | + | ИЮМ. Вып. 21. С. 144 |

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 21 | Марына Зянькоўна Гуркоўна Гарлінская | 1597 | + | | | | | | | | Там жа. С. 267 |
| 22 | Трафім Субота | 1626 | | + | + | | | | | | Там жа. С. 278 |
| 23 | Сафія Пагарэльская Кавалеўская | 1641 | + | | | | | + | | + | Там жа. С. 294 |
| 24 | Іосіф Бягунскі | 1653 | + | | | + | | | | | Там жа. С. 305 |
| 25 | Цімафей Падзвінскі | 1626 | + | | | | | | | + | Там жа. С. 461 |
| 26 | Марына Янішэўская Дуброўская | 1626 | + | | | + | | | | ? | Там жа. С. 437 |
| 27 | Міхаіл Дзмітровіч | 1626 | + | | | | | + | | + | Там жа. С. 443 |
| 28 | Лука Аўсеевіч | 1626 | + | | | | | | | + | Там жа. С. 452 |
| 29 | Іосіф Скраб | 1626 | | + | | | | | | | Там жа. С. 456 |
| 30 | Уладзіслаў Звярэўскі | 1714 | + | | | + | | | | + | ИЮМ. Вып. 22. С. 110 |
| 31 | Алена Громава | 1626 | | + | | | | | | | Там жа. С. 211 |
| 32 | Пётр Чалінскі | 1627 | + | | | + | | | | + | Там жа. С. 223 |
| 33 | Іван Харкоўскі | 1627 | + | | | | | | | + | Там жа. С. 239 |
| 34 | Фёдар Аляксандравіч Сялява | 1602 | + | | | | | | | + | Там жа. С. 273 |
| 35 | Іосіф Корсак Удзельскі | 1645 | + | | | + | + | | + | | Там жа. С. 335 |
| 36 | Вацлаў Дзеражынскі | 1635 | + | | | + | | | | + | ИЮМ. Вып. 24. С. 239 |
| 37 | Алена Шаверноўская Асіпоўская | 1719 | + | | | + | | | | + | ИЮМ. Вып. 25. С. 116 |
| 38 | Грыгорый Ушацкі | 1637 | + | | + | | | | | | Там жа. С. 173 |
| 39 | Андрэй Парадня | 1670 | + | | + | | | | | | Там жа. С. 250 |

*Заканчэнне табл.*

| № | Складальнік | Год скла-дання | Саслоўе | | Распараджэнні адносна месца пахавання | | | | | | Крыніца |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Шляхта | Мяшчане | Могілкі пры храме | У храме | У храме пад алтаром / парогам | У / каля капліцы | Мана-стырскія могілкі | У маёнт-ку | |
| 40 | Кацярына Буйніцкая | 1671 | + | | + | | | | | | *1* ИЮМ. Вып. 26. С. 239 |
| 41 | Аляксандр Косаў | 1641 | + | | | + | | | | + | Там жа. С. 97 |
| 42 | Марына Біруля | 1641 | + | | | | | | | + | Там жа. С. 106 |
| 43 | Грыгорый Багамолец | 1641 | + | | + | | | + | | + | Там жа. С. 120 |
| 44 | Ганна Чаркас | 1671 | + | | + | | | | | | Там жа. С. 220. |
| 45 | Грыгорый Геранімавіч Ісаковіч | 1721 | + | | + | | | | | | ИЮМ. Вып. 27. С. 253 |
| 46 | Міхаіл Герцык | 1760 | + | | | + | | | | | Там жа. С. 359 |
| 47 | Сабіна Лявіцкая | 1759 | + | | | + | + | | | | Там жа. С. 391 |
| 48 | Вікторыя Мярэцкая | 1761 | + | | | + | + | | | | Там жа. С. 405 |
| 49 | Вячаслаў Матусевіч | 1761 | + | | | | | | | | Там жа. С. 431 |
| 50 | Балцэр Багданавіч Старасельскі | 1600 | + | | | | | | | + | ИЮМ. Вып. 31. С. 66 |
| 51 | Юрый Мікалаевіч Зяновіч | 1582 | + | | | + | | | | | Завещание Юрия Деспота Зеновича. С. 504 |

*Табліца 2.* **Распараджэнні складальнікаў тастаментаў адносна месца пахавання (паводле згадак у навуковай літаратуры)**

| № | Складальнік | Год скла-дання | Саслоўе | | Распараджэнні адносна месца пахавання | | | | | | Крыніца |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Шляхта | Мяшчане | Могілкі пры храме | У храме | У храме пад алтаром / парогам | У / каля капліцы | Мана-стырскія могілкі | У ма-ёнтку | |
| 1 | Арына Лукашэвічова | 1656 | | + | | + | | | | | Дук Д. В. Археологиче-ские следы средневеко-вых кладбищ на терри-тории Полоцка. С. 149 |
| 2 | Настасся Павукова | 1656 | | + | | + | | | | | Там жа |
| 3 | Крыштоф Мірскі | 1663 | + | | | + | + | | + | | Hedemann O. Testamenty brasławsko-dziśnieńskie XVII–XVIII wieku. S. 13 |
| 4 | Ян Гарадзенскі | 1793 | + | | | | | | + | | Ibid. S. 13 |
| 5 | Уладзіслаў Бясецкі | 1729 | + | | + | | | | | | Ibid |
| 6 | Іасафат Корсак | 1792 | + | | | | | | + | | Ibid. S. 14 |
| 7 | Тадэвуш Буйніцкі | 1799 | + | | | + | | | | | Ibid. S. 16 |
| 8 | Канстанцыя Корсакава | 1696 | + | | | + | + | | + | | Ibid |
| 9 | Ян Корсак Галубіцкі | 1725 | + | | | + | + | | + | | Ibid |
| 10 | Разалія Корсакава | 1797 | + | | + | | | | | | Ibid |
| 11 | Казімір Якавіцкі | 1758 | + | | + | | | | | | Ibid |
| 12 | Элеанора Корсакава | 1784 | + | | + | | + | | | | Ibid |
| 13 | Іосіф Корсак | 1640, 1643 | + | | + | | + | | | | Ibid |
| 14 | Іосіф Гільзэн | 1781, 1783 | + | | + | +? | | | | + | Ibid. S. 16–17 |
| 15 | Ігнацій Бужынскі | 1793 | + | | | + | | | | | Ibid. S. 17 |

павета ў XIX ст., сяляне перад смерцю рабілі апошнія распараджэнні, у тым ліку адносна абставін уласнага пахавання[1]. Пры гэтым распараджэнні сялян былі вуснымі, завяшчанні сялян на сённяшні момант невядомы[2], у той час як тэстатарамі з’яўляліся шляхцічы і мяшчане. Пажаданні нямоглага ці хворага аб абставінах уласнага пахавання могуць быць часткай практыкі, пашыранай сярод усіх саслоўных груп.

Распараджэнні складальнікаў адносна месца пахавання сустракаюцца часта, але маюцца не ва ўсіх тастаментах (табл. 1). Сярод шляхты распаўсюджаным жаданнем было пахаванне ва ўласных уладаннях. Як вынікае з некаторых тастаментаў, шляхціцаў маглі хаваць не толькі на царкоўных ці касцёльных могілках, але і на могілках, дзе храмаў ці капліц не было. Сустракаліся выпадкі пахавання ўвогуле па-за могілкамі, у любым месцы, якое спадабалася ўладальніку маёнтка. Напрыклад, зямянін Міхаіл Скірмант прасіў пахаваць яго проста ў маёнтку Галоўчычы, Фёдар Аляксандравіч Сялява – «у маёнтку маім Відыніцкім», Іван Харкоўскі – «на грунце нашым Мішкаўскім», Балцэр Багданавіч Старасельскі – «у маёнтку маім Старым Сяле»[3]. Лука Аўсеевіч жадаў быць пахаваным «на грунце маім Мядзеленскім, на гары, за сажалкай, пад дубам», а Андрэй Якубавіч Сівіцкі – «у маёнтку маім Добрыне.., у агародзе маім, пад дваром маім Добрынам, каля саду майго»[4].

У некалькіх тастаментах узгадваюцца капліцы. Зямянін Міхаіл Дзмітровіч жадае быць пахаваным «пры капліцы бацькі», Сафія Пагарэльская Кавалеўская – у склепе капліцы, дзе пахаваны яе «мілы малжонак». «Капліччку збудаваць» просіць над сваім пахаваннем згаданы Андрэй Якубавіч Сівіцкі. Аналагічную просьбу мае Грыгорый Багамолец (праўда, ён прасіў пахаваць

[1] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1890. Т. I, ч. II. С. 507, 510.

[2] Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. С. 19.

[3] Гардзееў М. Ю., Сліж Н. У. Шляхецкія тэстаменты ў актавай кнізе полацкага магістрата за 1656–1657 гады. С. 33–34; ИЮМ. Вып. 22. С. 239, 273; Вып. 31. С. 66.

[4] ИЮМ. Вып. 21. С. 452; Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. С. 203–205.

сябе не «ў агародзе», а больш «стандартна»: «пры царкве нашай святога Міколы ў маёнтку маім Пагосцічах»)[1].

Часцей месцам спачыну станавіўся храм (царква ці касцёл), размешчаны на шляхецкіх землях. Так зямянін Алехна Паўлавіч Варатынец прасіў пахаваць яго «пры царкве Святой Прачыстай Багародзіцы ў Вялікім Сяле», Вацлаў Дзеражынскі – «у царкве Папіньскай», Тэадора Янова Прэвальская – «у царкве Быева Выжляціна»[2]. Відаць, названыя храмы былі пабудаваны тэстатарамі або падтрымліваліся імі. У шэрагу выпадкаў аўтары прама ўказвалі на гэта. Валерыян Арэхавінскі жадаў быць пахаваным «у касцёле, мною збудаваным на Мнюце», Аляксандр Косаў – у «царкве нашай Будавесцкай», Алена Шавярноўская Асіпоўская – «у царкве нашай уласнай»[3].

Фундацыя і падтрыманне храма, абранага як месца апошняга прытулку, таксама можа разглядацца як клопат тэстатара аб падрыхтоўцы ўласнага пахавання. Шляхцянка Марына Янішэўская Дуброўская пазначыла, што абрала царкву «святога Спаса Гразінскага» не ў апошні момант, а загадзя[4].

У адзінкавых выпадках шляціцы выказвалі пажаданні быць пахаванымі ў храмах у чужых уладаннях. Мацвей Мікалаевіч Мажэйка завяшчаў пахаваць сябе «ў царкве Святой Прачыстай на Ловажы, у маёнтку яго міласці пана Станіслава Герцыка». Пётр Чалінскі, які служыў у віцебскага кашталяна Сямёна Ковельскага, прасіў пахаваць яго ў маёнтку апошняга Смаляны ў склепе касцёла, што тады будаваўся. Калі б гэта было б немагчымым, месцам спачыну Пятра Чалінскага мусіла стаць царква ў маёнтку жонкі[5].

Прадстаўнікі шляхецкага стану знаходзілі спакой таксама ў манастырскіх храмах і на кляштарных могілках. Іосіф Корсак

---

[1] ИЮМ. Вып. 21. С. 294, 443; Вып. 26. С. 120; Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. С. 203–205.

[2] Там жа. С. 144; Вып. 24. С. 239; Там жа. С. 225, 227.

[3] Галубовіч В. У. Тэстамент 1623 года полацкага зямяніна Арэхавінскага. С. 31; ИЮМ. Вып. 25. С. 116; Вып. 26. С. 97.

[4] ИЮМ. Вып. 21. С. 437.

[5] ИЮМ. Вып. 22. С. 227; Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. С. 232.

Удзельскі прасіў пахаваць яго ў касцёле ўдзельскага францысканскага кляштара, фундатарамі якога былі ён разам з жонкай. Крыштоф Мірскі хацеў быць пахаваным у друйскім бернардзінскім касцёле, Ян Корсак Галубіцкі і Канстанцыя Корсакава – у глыбоцкім касцёле кармелітаў, Іасафат Корсак – у дзісненскім францысканскі кляштары, Міхаіл Герцык – у дамініканскім касцёле ва Ушачах[1].

Сустракаліся і пажаданні быць пахаванымі ў храмах, якія размешчаліся ў буйных гарадах, або на могілках пры іх. Зямянін Шчасны Пятровіч Храноўскі завяшчаў пахаваць яго на могілках пры касцёле Святой Тройцы ў Віцебскім Ніжнім замку, Занка Алехнавіч Рамейка Хоцімскі – «у Светого Духа», а браслаўскі староста Ігнацый Бужынскі – у касцёле святога Казіміра ў Вільні[2].

Пахаванні ў храмах і на прыхрамавай тэрыторыі адрозніваліся паводле статуснасці. Больш прэстыжным лічылася месца ў самім храме, асабліва пад алтарнай часткай і ў адмысловых нішах у сцяне. Там хавалі вышэйшае духавенства і найбольш шчодрых фундатараў і кціtараў. За пахаванне ў сцяне друйскага касцёла Крыштоф Мірскі завяшчаў бернардзінскаму кляштару 5000 злотых. Пахаванне ў склепе пад алтаром глыбоцкага касцёла абышлося Яну Корсаку Галубіцкаму і Канстанцыі Корсакавай у 20 200 і 7000 злотых адпаведна. Для параўнання, за пахаванне на могілках пры тым жа касцёле Разалія Корсакава ахвяравала каля 500 злотых[3].

Дэманстрацыяй хрысціянскай пакоры было пахаванне перад касцёльнымі дзвярамі, на праходзе, па якім хадзілі вернікі. Менавіта так прасіў пахаваць сабе згаданы Шчасны Пятровіч Храноўскі («на цвінтару... насупраць дзвярэй касцёльных»), шляхцянка

[1] ИЮМ. Вып. 22. С. 335; ИЮМ. Вып. 27. С. 359; Hedemann O. Testamenty brasławsko-dziśnieńskie XVII–XVIII wieku jako źródło historyczne. S. 13–16.

[2] Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. С. 220, 222; Hedemann O. Testamenty brasławsko-dziśnieńskie XVII–XVIII wieku jako źródło historyczne. S. 17.

[3] Hedemann O. Testamenty brasławsko-dziśnieńskie XVII–XVIII wieku jako źródło historyczne. S. 16.

Сабіна Лявіцкая (у чашніцкім дамініканскім касцёле, «пад парогам касцёльным у зямлі»), Іосіф Корсак і Элеанора Корсакава[1].

Мяшчане выказвалі пажаданні быць пахаванымі на могілках каля храмаў або ў саміх храмах. Так, маці Сімяона Полацкага Таццяна Якаўлеўна Шараметава прасіла пахаваць яе «пры царкве Святога Багаяўлення». Палачанкі Арына Лукашэвічава і Настасся Паўкова хацелі быць пахаваныя ў той жа царкве Багаяўлення (Настасся Паўкова – у прытворы). Пры кафедральным (Прачысценскім) саборы ў Віцебску хацелі быць пахаваны Еўфрасіння Мікалаеўна Чарнаброўкава і Трафім Субота, на могілках прыходскай Увядзенскай царквы – Еўдакія Шыбра. Віцебская мяшчанка, жонка Міхаіла Лагошнага, імя якой не названа, жадала быць пахаванай у базыльянскім храме, лаўнік Павел Савіцкі – у царкве святога Пятра[2]. У цэлым распараджэнні мяшчан адносна месца пахавання менш варыятыўныя.

Шэраг гарадскіх могілак, згаданых у тастаментах, на сённяшні момант лакалізаваны і часткова археалагічна даследаваны. Гэта датычыцца некропалей каля Богаяўленскага сабора ў Полацку, Прачысценскай (Успенскай) і Увядзенскай цэркваў у Віцебску. Адкрыты і шэраг гарадскіх могільнікаў, не ўзгаданых у тастаментах. У сутарэннях віцебскай царквы Святога Духа (дзе жадаў быць пахаваным мешчанін Занка Алехнавіч) выяўлены пахавальныя нішы[3]. Труны з пахаваннямі ўніяцкага духавенства ў скляпеннях аднаго з храмаў Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра ў Полацку і шматлікія непахаваныя косці ў сутарэннях полацкага касцёла Узнясення бачыў у канцы XIX ст. мастак Д. М. Струкаў[4]. Інфармацыя пісьмовых крыніц аб высокім

[1] ИЮМ. Вып. 27. С. 391; Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. С. 220, 222; Hedemann O. Testamenty brasławsko-dziśnieńskie XVII–XVIII wieku jako źródło historyczne. S. 16.

[2] Гордеев М. Ю. Новые данные к биографии Симеона Полоцкого. С. 47; Дук Д. В. Археологические следы средневековых кладбищ на территории Полоцка. С. 149; ИЮМ. Вып. 19. С. 62–63, 216, 253; Вып. 21. С. 278.

[3] Дук Д. В. Археологические следы средневековых кладбищ на территории Полоцка. С. 145–149; Левко О. Н. Витебск. Минск, 2010. С. 208, 212, 218–222.

[4] Струков Д. М. Альбом рисунков, 1864–1867 [Изоматериал]. Минск, 2011. С. 14.

сацыяльным статусе асоб, пахаваных у храмах і на могілках недалёка ад іх, пацвярджаецца археалагічным матэрыялам. Пры амаль суцэльнай безынвентарнасці пахаванняў XVI–XVIII стст. у такіх пахаваннях сустракаецца дарагая вопратка, упрыгажэнні і прадметы–маркеры рэлігійнай прыналежнасці[1].

Такім чынам, тастаменты шляхты і мяшчан Паўночнай Беларусі XVI–XVIII стст. з'яўляюцца інфарматыўнай крыніцай аб пахавальнай практыцы гэтага перыяду. У большасці з іх прысутнічаюць распараджэнні аб месцы пахавання. Шляхецкія завяшчанні дэманструюць вялікую варыятыўнасць месцаў пахавання. Прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя выказвалі жаданне знайсці апошні прытулак ва ўласных маёнтках і па-за іх межамі, у цэрквах і касцёлах, у капліцах, у манастырах і кляштарах, на царкоўных і касцёльных могілках, па-за межамі могілак у прыгожых месцах, у гарадах. Мяшчане прасілі пахаваць іх у храмах ці на могілках каля храмаў. Найбольш статуснымі месцамі для пахавання з'яўляліся сутарэнні храмаў і могілкі побач з імі. Археалагічныя даследаванні выявілі шэраг некропаляў Полацка і Віцебска, згаданых у тастаментах, а таксама некалькі могілак, якія не ўзгадваюцца ў завяшчаннях. Раскопкі пацвярджаюць, што пахаванні ўнутры храмаў і на набліжанай да храмавых будынкаў тэрыторыі належалі людзям з высокім сацыяльным статусам.

[1] Левко О. Н. Витебск. С. 222.

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

ВЫПУСК 3




# Вялікае Княства Літоўскае:

## Заканадаўчае забеспячэнне дзяржаўнага суверэнітэту

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

**ЗБОРНІК НАВУКОВЫХ АРТЫКУЛАЎ**

***Заснаваны ў 2018 годзе***

ВЫПУСК 3

# Вялікае Княства Літоўскае:
## Заканадаўчае забеспячэнне дзяржаўнага суверэнітэту

Мінск
«Беларуская навука»
2022

## ЗМЕСТ

**Спіс скарачэнняў** ... 3

**Прадмова** ... 5

**Да гістарыяграфіі праблемы** ... 12

*Людміла Мікалаева.* Погляд на ўзаемаадносіны Вялікага Княства Літоўскага з Польскім Каралеўствам канца XIV – сярэдзіны XVI ст. у польскай гістарыяграфіі ... 12

*Наталья Козловская.* Унии ВКЛ и Польского Королевства в XIV–XVI вв. в современной белорусской и польской историографии: сравнительный анализ ... 23

*Анастасія Скеп'ян.* Праблема уній у падручніках па гісторыі Беларусі ў XX – пачатку XXI ст. ... 38

**Праблемы суверэнітэту і уніі з Польскім Каралеўствам** ... 57

*Алег Дзярновіч.* «Дзень народзінаў» Вялікага княства: тытулатура вялікага князя літоўскага і праблемы суверэнізацыі ВКЛ у сярэдзіне XIII – першай палове XV ст. ... 57

*Ніна Скеп'ян.* Стаўленне да уніі з Каронай Польскай канцлераў Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XV – першай трэці XVI ст. ... 82

*Аляксей Шаланда.* Канфлікт валынцаў з жамойтамі на Люблінскім сойме ў лютым 1569 г. ... 95

*Tomasz Kempa.* Litewskie poselstwo na Wołyń w 1572 r. – nieudana próba "naprawy unii" ... 105

*Константин Ерусалимский.* Иван Грозный и Люблинская уния (в свете посольской переписки России и Великого княжества Литовского) ... 123

*Андрэй Самусік.* Уплыў Люблінскай уніі на развіццё адукацыі ў ВКЛ у апошняй трэці XVI – сярэдзіне XVII ст. ... 153

*Віталь Галубовіч.* Палітычныя інтарэсы «літоўскага народа» на соймах Рэчы Паспалітай (паводле інструкцый шляхты беларускіх зямель Вялікага Княства Літоўскага 1630–1640-х гг.) ... 164

*Яўген Глінскі.* «З тым кляйнотам з Кароны яшчэ ў часы Ягайлы ў Вялікае Княства Літоўскае прыйшлі…»: сапраўднае і легендарнае ва ўяўленнях аб польскім паходжанні асобных шляхецкіх родаў ВКЛ у XVI–XVIII стст. ........ 174

*Арсений Богатырёв.* Литовский канцлер Христофор Пац в 1670-х гг.: прежние оценки и новые данные ........ 186

*Robert Kołodziej.* Czy w czasach Jana III Sobieskiego funkcjonował osobny sejm litewski? ........ 196

*Аляксандр Ерашэвіч.* З гісторыі ўзаемаадносін Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага ў сферы публічных фінансаў у час панавання Станіслава Аўгуста Панятоўскага ........ 207

*Святлана Марозава.* Леў Сапега на абароне дзяржаўнага суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага ........ 231

**Статут 1588 г.: заканадаўчыя гарантыі суверэнітэту ВКЛ і практыка яго выкарыстання** ........ 246

*Андрей Кузьмин.* О возможном общем источнике статей о смертной казни в Псковской судной грамоте 1467 г. и Судебнике Казимира IV Ягеллончика 1468 г. ........ 246

*Таісія Доўнар.* Развіццё асноўных інстытутаў права ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. ........ 269

*Andrzej Zakrzewski.* Statut 1588 r.: gwarancja prawnej suwerenności Wielkiego Księstwa Litewskiego czy złudzenie? ........ 281

*Константин Купченко.* Применение норм Статута 1588 г. в смоленских землях ........ 301

*Ніна Скеп'ян.* Роля канцлера ў прыняцці Статутаў ВКЛ у XVI ст. ........ 311

*Piotr M. Pilarczyk.* III Statut Litewski w praktyce sądowej Komisji Skarbu Wielkiego Księstwa Litewskiego ........ 326

*Gitana Zujienė.* Ceremonie inauguracyjne woźnich i konsekwencje złamania ich przysięgi zgodnie ze Statutem Litewskim i orzecznictwem sądowym WKL pod koniec XVI – w pierwszej połowie XVII w. ........ 337

*Aleksandra Skrzypietz.* Okoliczności uchwalenia koekwacji praw w 1697 r. Czy "zachowanie odrębności" nadal odpowiadało interesom szlachty Wielkiego Księstwa Litewskiego? ........ 349

*Аляксей Шаланда.* Геральдычная гравюра з тытульнага аркуша польскамоўнага выдання 1614 г. III Статута ВКЛ: паходжанне, змест, функцыі ... 366

*Оксана Коваленко.* Статут 1588 г. и правовой статус ремесленников Гетманщины XVIII в. ........ 381

*Сяргей Сергачоў.* Кірункі рэгулявання будаўнічай дзейнасці ў артыкулах Статута ВКЛ 1588 г. ........ 389

*Валянцін Голубеў.* Статут ВКЛ 1588 г. аб этнасах-заснавальніках і ўнутрыпалітычнай арганізацыі дзяржавы .......... 400

*Яўген Казанцаў.* Млынарства ў прававой сістэме ВКЛ.......... 412

*Віктар Чараўко.* Тастаменты і пахавальная практыка насельніцтва Паўночнай Беларусі XVI–XVIII стст.: месца пахавання .......... 416

*Леся Худояр.* Концепция принципа равенства в нормах Статута 1588 г..... 428

*Алена Барсук.* Свабода веравызнання ў Статуце ВКЛ 1588 г. і практыка канфесійнага жыцця Рэчы Паспалітай.......... 433

*Ерашэвіч Аляксандр.* Некаторыя заўвагі аб скасаванні Статута ВКЛ 1588 г. у губернях Беларусі .......... 444

*Юрий Грузицкий.* Кодификация ипотеки в Статутах Великого княжества Литовского .......... 475

Навуковае выданне

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

**Зборнік навуковых артыкулаў**

Выпуск 3

# ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ: ЗАКАНАДАЎЧАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЯРЖАЎНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ

Укладальнік

**Скеп'ян** Анастасія Анатольеўна

*На беларускай, рускай, польскай мовах*

У афармленні першай старонкі вокладкі выкарыстаны трыпціх Ігара Гардзіёнка «29 чэрвеня 1569 г.».

Рэдактар *А. М. Масухранава*
Мастацкі рэдактар *У. У. Дамнянкоў*
Тэхнічны рэдактар *М. В. Савіцкая*
Камп'ютарная вёрстка *С. М. Касцюк, Ю. А. Агейчык*

Падпісана да друку 23.02.2022. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная.
Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 28,6. Ул.-выд. арк. 28,7.
Тыраж 300 экз. Заказ 30.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука». Пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013, № 2/196 ад 05.04.2017. Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, г. Мінск.